**Куракова І.Я.**

**ДАКУМЕНТЫ ГЕРМАНСКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД ЯК КРЫНІЦА ДЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ФІНАНСАВАЙ ПАЛІТЫКІ Ў ГЕНЕРАЛЬНАЙ АКРУЗЕ "ВАЛЫНЬ-ПАДОЛЛЕ" 1941–1944 гг. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДЗЯРЖАРХІВА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ)**

У дзяржаўных абласных архівах Беларусі зберагаецца значны комплекс матэрыялаў, які адлюстроўвае як агульныя, так і рэгіянальныя аспекты акупацыйнага рэжыму 1941–1944 гг. на тэрыторыі Беларусі. З прычыны працяглай закрытасці фондаў і напісання дакументаў пераважна на нямецкай мове яны і на сённяшні дзень застаюцца малазапатрабаванымі ў даследчыкаў. Дадзеная акалічнасць у поўнай меры адносіцца і да акупацыйных фондаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). Комплекс арыгінальных першакрыніц ДАБВ з'яўляецца ключавым па пытанні фінансавай гаспадаркі і спецыфічным характары яе правядзення ў дазенай акрузе, дае магчымасць выявіць маштабы і спецыфіку эканамічнай экспансіі акупантаў, а таксама параўнаць яе праявы ў іншых адміністрацыйна-тэрытарыяльных зонах, створаных нямецкімі ўладамі на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.

Дакументы ДАБВ перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў першую чаргу датычыцца беларускіх зямель, уключаных у склад створанай нямецкім кіраўніцтвам новай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі – генеральнай акругі "Валынь-Падолле", якая з'яўлялася часткай Рэйхскамісарыята Украіна. Сярод фактараў, якія паўплывалі на вырашэнне гэтага пытання, перш за ўсё, трэба назваць эканамічныя. Такі падзел забяспечваў РК "Украіна" лесам і дрэваматэрыяламі, а таксама ствараліся ўмовы для выкарыстання сістэмаў каналаў Прыпяці і чыгункі Брэст-Гомель. У названую генеральную акругу былі ўключаны паўднёва-заходнія вобласці Беларусі – Брэсцкая, Пінская і Паслеская, плошчай каля 20 200 кв. км. з першапачатковай колькасцю насельніцтва амаль што 750 тыс. чалавек. У верасні 1941 г. гэта складала 1/6 частку ўсяго насельніцтва і 1/4 усёй тэрыторыі "Вылынь-Падолле". На чале генеральнай акругі стаў генеральны камісар Шоне, адміністрацыйным цэнтрам з'яўляўся Брэст, а з 1942 г. Луцк.

У фондах ДАБВ матэрыялы па фінансавай палітыцы займаюць даволі значнае месца. Яны прадстаўлены дакументамі акупацыйнай улады, устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў (Брэсцкага, Баранавіцкага і Пінскага акруговых камісарыятаў, гарадскіх, раённых і валасных упраў, гаспадарчых арганізацый за 1941–1944 гг.), адлюстроўваюць ўсталяванне "новага парадку" і палітыку нямецкіх улад у дачыненні да мясцовага насельніцтва.

Фонды згрупаваны па аддзелах і ахопліваюць: дакументы органаў акупацыйнай улады і кіравання (*ф. 192 – Брэст-Літоўскі акруговы камісар Генеральнага камісара Падолля і Валыні; ф. 201– Брэсцкая гарадская ўправа; ф. 658 – Нова-Мышская раённая ўправа*); матэрыялы органаў аховы акупацыйнага рэжыму (*ф. 2120 – Пінскі акруговы камісарыят Генеральнага Камісарыята Валынь-Падолле; ф. 2135 – Пінскае гарадское Упраўленне Пінскага акружного камісарыята*); дакументы гаспадарча-эканамічных і фінансавых ўстаноў (*ф. 2150 – Пінскае аддзяленне Брэст-Літоўскага гаспадарчага банка; ф. 197 – Высокаўскі філіял Бельскай краёвай ашчаднай касы*); арганізацый, прадпрыемстваў, гандлёвых фірм і акцыянерных таварыстваў (*ф. 683 – Навамышская раённая кантора ЦГТ "Усход"*) і іншыя. Распараджэнні нямецка-



Репозиторий ВГУ

фашысцкіх улад у галіне фінансавай гаспадаркі друкаваліся ў перыядычных выданнях генеральнай акругі “Валынь-Падолле”, напрыклад “Пінская газета”, “Наша слова”, “Новая дарога”, “Раніца” і іншыя, а таксама агітацыйных матэрыялах (аб’явы, улёткі, брашуры).

Большасць крыніц уяўляе справаводчую дакументацыю, якая ўзнікла ў працэсе практычнай дзейнасці органаў кіравання, устаноў і арганізацый. Дакументы на нямецкай і ўкраінскай мовах, зрэдку сустракаюцца на рускай, польскай ці беларускай. Стан захаванасці добры. Дакументы ў асноўным друкаваныя і з’яўляюцца арыгінальнымі крыніцамі, інфармацыйна насычаныя. Яны паказваюць адметнасці фінансавай палітыкі ў генеральнай акрузе “Валынь-Падолле”. Паводле відавой класіфікацыі можна вылучыць: арганізацына-распарадчыя дакументы, матэрыялы кадравага характару, справаздачную, фінансавую і даведачна-інфармацыйную дакументацыю. Паводле паходжання – дакументы акружных, гарадскіх і раённых камісарыятаў.

Асаблівасці і маштабы рэалізацыі фінансавай палітыкі адпавядалі патрэбам ваеннага часу і загадзя створаным планам. Для генеральнай акругі “Валынь-Падолле” і іншых зон акупацыі з цывільным кіраўніцтвам была распрацавана т.зв. “Карычневая папка”. Арыгінальная назва дакумента – *“Die Zivilverwaltung in den besetzten Ostgebieten (Braune Mappe). Teil A: Richtlinien für die Wirtschaftsführung”* – “Цывільнае кіраванне на занятых усходніх тэрыторыях (Карычневая папка). Частка А: Дырэктывы па вядзенні гаспадаркі” [1, арк.1–39]. Рэалізацыяй фінансавых планаў займаліся органы і ўстановы акупацыйных улад праз механізмы крэдытна-грашовай палітыкі, падаткаабкладанне і цэнаўтварэнне.

Генерыравалася фінансавая палітыка галоўным чынам у банкаўскіх установах. У гэтай сувязі значную цікавасць уяўляюць дакументы Пінскага аддзялення Брэст-Літоўскага гаспадарчага банка ў г. Пінску [2]. Дадзеныя матэрыялы ўтрымліваюць дырэктыўныя ўказанні Цэнтральнага і Брэсцкага банкаў, цыркуляры Саюза гаспадарчых банкаў Украіны, спісы банкаў, іх філіялаў і аддзелаў, перапіску з прадпрыемствамі аб парадку пералічэння грошай, адкрыцці рахункаў і па шматлікім іншым фінансавым пытанням.

На тэрыторыі генеральнай акругі “Валынь-Падолле” яшчэ на пачатку вайны пачалі дзейнічаць гаспадарчыя банкі, філіялы і іх аддзяленні. Спачатку яны адкрываліся на месцах былых савецкіх Дзяржаўных банкаў, а потым адчыняліся і новыя, спецыяльна створаныя акупантамі філіялы. Даволі інфарматыўнай крыніцай, якая раскрывае колькасныя паказчыкі наяўнасці створаных нямецкімі ўладамі банкаўскіх устаноў, з’яўляюцца *“Списки господарських банків, філій та відділів, станом на 14 липня 1941р.”* [3, арк. 1–3]. Згодна дакументу, на 14 ліпеня 1941 г. па генеральнай акрузе “Валынь-Падолле” налічвалася 5 гаспадарчых банкаў і больш за 50 іх філіялаў і аддзелаў. Да верасня 1942 г. на тэрыторыі РК “Украіна” дзейнічала 17 галіновых гаспадарчых банкаў і больш за 200 філіялаў. Іншыя матэрыялы фондаў адзначаюць асаблівасці працы банкаўскіх устаноў, забеспячэнне іх адпаведнымі кадрамі, вызначаюць функцыі і метады работы ў ходзе правядзення крэдытных аперацый і іншае.

Матэрыялы фонда паведамляюць пра адкрыццё 5 сакавіка 1942 г. галоўнай банкаўскай установы – Цэнтральнага эмісійнага банка Украіны з месцам знаходжання ў Роўна. Банк меў права выпуску сваіх банкнот – карбованцаў, наміналам ад 5 да 500. Курс 1 карбованца раўняўся 1 рублю, а 10 карбованцаў = 1 рэйхсмаркі [4, арк. 4–5]. Насельніцтва павінна было ў тэрмін да 25 ліпеня 1942 г. абмяняць савецкія грошы ў купюрах ад 5 рублёў і вышэй на карбованцы. Аднак пры абмене савецкіх купюр наміналам больш за 10 рублёў новыя грошы на рукі не выдаваліся, а залічваліся на беспрацэнтны банкаўскі рахунак [5, арк. 2]. Такім чынам, фактычна здзяйснялася канфіскацыя савецкіх грошай. Акупацыйная перыёдыка паведамляла пра вынікі дзейнасці Цэнтральнага эмісійнага банка, і адзначла, што яго грашовы абарот на 17.09.1942 г. складаў 1,58 міліярдаў карбованцаў [6, арк. 3–4]. Нямецкі персанал на акупаванай тэрыторыі займаўся банкаўскай справай толькі ў нязначным аб’ёме і на самых вышэйшых пасадах. Кваліфікацыя і прафесіяналізм работнікаў банка немцаў амаль не цікавіла. Структура іх дзейнасці, а таксама функцыі служачых адлюстроўваліся ў цыркулярах вышэйшага кіраўніцтва, якое было зацікаўлена толькі ў забеспячэнні інтарэсаў Германіі [7, арк. 1–5].

Фонды змяшчаюць багаты матэрыял пра фінансавае забеспячэнне акупацыйных улад, войск вермахта і бюджэта рэйха. Дакументы ўтрымліваюць дырэктывы і цыркуляры па падаткаабкладанні, інструкцыі генеральных і акруговых камісараў аб вылічэнні і абкладанні падаткамі. Віды падаткаў, памеры іх ставак, а таксама аб’ёмы натуральных паставак карэктаваліся на працягу 1941–1944 гг. Сістэма падаткабкладання складалася не толькі з гра-



Репозиторий ВГУ

шовых падаткаў і збораў, а таксама і з натуральных паставак і страхавых узносаў [8, арк. 6–7]. Існавалі і розныя штрафы, напрыклад за парушэнне парадку вулічнага руху ці паліцэйскіх гадзін [9, арк. 48].

Акупанты падкрэслівалі, што да падаткаабкладання мясцовага насельніцтва яны падыходзяць дыферэнцавана. Ільготамі карысталіся тыя, хто супрацоўнічаў з нацыстамі ці пацярпеў ад савецкай улады, нямецкія прадпрыемствы, якія працавалі на акупаваных тэрыторыях [10, арк. 4], а таксама асобы нямецкай народнасці і германскія падданыя. У некаторых рэгіёнах ад падаткаў вызвалялі праваслаўныя храмы [11, арк. 3]. Шматлікія даклады аб рэвізіях фінансавай дзейнасці ў гарадах і мястэчках сведчаць аб дрэнна наладжанай працы падатковых аддзелаў. Так у г. Пінску летам 1942 г. згодна дакладу рэвізіі фінансавай дзейнасці, асобы свабодных прафесій, якія мелі самастойныя крыніцы даходаў ад прыватнай практыкі (лекары, фельдчары, акушэры, духавенства) абкладанню падаткам прыцягнуты не былі. А вось спагнанне падаткаў з габрэяў (10 руб. з чалавека ў месяц), якое адбывалася праз юдэнрат, было ў поўным аб’ёме. З 1 студзеня 1942 г. па 1 чэрвеня 1942 г. ад габрэяў у касу горада паступіла 995 945 рублёў [12, арк. 7–34]. Гэтыя факты дэманструюць грабежніцкі некантралюемы характар сістэмы падаткаабкладання, наладжаны акупацыйнымі ўладамі.

Дакументы па цэнаўтварэнні на тэрыторыі генеральнай акругі “Валынь-Падолле” уключаюць распараджэнні гандлёвага аддзела аб усталяванні коштаў на тавары і паслугі, распараджэнні аб правілах продажу, прэйскуранты цэн для розных катэгорый паслуг насельніцтву, інфармацыю аб дзейнасці цэнтральнага гандлёвага таварыства "Усход" і іншае. На тэрыторыі генеральнай акругі “Валынь-Падолле” з мэтай кантраляваць працэсы цэнаўтварэння друкаваліся аб’явы тыпу *“Найвищі ціни на продукти харчування”* [13, арк. 15–17]. Але “цвёрды” кошт на тавары ўстанавіць было немагчыма. Паўсюдна назіраўся дэфіцыт тавараў. Недахоп прадукцыі па “вызначыных” цэнах у шырокім гандлі садзейнічаў узнікненню “чорнага” ці нелегальнага рынку, спекуляцыі і прамога прадуктаабмена. Для свабоднага вывазу тавараў у Германію з РК “Украіна” і іх ўвозу на тэрыторыю рэйхскамісарыята наладжваўся транзітны гандаль. Пэўныя фінансавыя механізмы рэгулявалі гэты працэс і паміж рэйхскамісарыятамі Остланд і Украіна [14, с. 4].

Такім чынам, матэрыялы фондаў ДАБВ утрымліваюць асноўны комплекс крыніц па акрэсленай праблеме і ўяўляюць значную цікавасць для даследчыкаў перыяду акупацыі Беларусі 1941–1944 гг. Вывучэнне зместу комплекса дакументаў германскіх акупацыйных улад дазваляе зрабіць выснову пра інфармацыйную насычанасць крыніц, што дазваляе выкарыстоўваць іх пры даследаванні фінансавай палітыкі на тэрыторыі генеральнай акругі “Валынь-Падолле” і параўноўваць з падобнымі дакументамі, якія выдаваліся ў іншых акупацыйных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках.

Літаратура


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. − Ф. 652. − Воп. 1. − Спр. 2.
2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). − Ф. 2150. − Воп. 1. − Спр. 1−77.
3. ДАБВ. − Ф. 2150. − Воп. 1. − Спр. 10.
4. ДАБВ. − Ф. 2150. − Воп. 1. − Спр. 9.
5. ДАБВ. − Ф. 2150. − Воп. 1. − Спр. 9.
6. Господарски банки в Украини. Вимина грошей // Пинская газета. Орган окружного комиссара в Пинске. – 1942 року. – 17 вересня. – С. 3–4; – 1942 року. – 15 липня. − С. 2.
7. ДАБВ. − Ф. 2150. − Воп. 1. − Спр. 55.
8. ДАБВ. − Ф. 201. − Воп. 1. − Спр. 4975.
9. ДАБВ. − Ф. 201. − Воп. 1. − Спр. 4977.
10. ДАБВ. − Ф. 201. − Воп. 1. − Спр. 618.
11. ДАБВ. − Ф. 2120. − Воп. 1. − Спр. 332.
12. ДАБВ. − Ф. 2135. − Воп. 2. − Спр. 926.
13. ДАБВ. − Ф. 201. − Воп. 1. − Спр. 1322.
14. Транзитна торгівля між Генеральним губернаторством і Рейхськоміссаріатами Остланд і Україна // Пінськая газета (Орган Окружного Коммиссаріата в Пінське). – 1943 року. –19 березня. – С. 4.


Рэпазіторый ВДУ